Раздзел IV.

# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ І РАЗВІЦЦЯ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

А.І. Сцепанцоў,
загадчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

## Інфармацыйна-творчы рэсурс дадатковай адукацыі дарослых у сферы культуры: фарміраванне і развіццё

Кожны чалавек у сваёй прафесійнай дзейнасці задумваецца пра пошукі разнастайных рэсурсаў для яе ажыццяўлення. У першую чаргу, гэта азначае прыцягненне і разумнае выкарыстанне матэрыяльных (вытворчых), інфармацыйных і сацыяльных рэсурсаў. Сярод пазначаных груп рэсураў рухавіком для чалавечай актыўнасці, інтэлектуальнай і мастацкай напоўненасці жыцця з'яўляецца інфармацыйна-творчы рэсурс.

У сферы культуры *інфармацыйна-творчы рэсурс* састаўляе аснову і вызначае спецыфіку культурнай дзейнасці. Гэта асяродак культурных практык (мастацка-творчых, інтэлектуальных) у вобласці візуальных і выканальніцкіх мастацтваў; рамёстваў і дызайну; кіно, тэлебачання і медыя. Тэатральныя і канцэртныя ўстановы даюць гледачам эстэтычную, мастацкую і эмацыянальную інфармацыю, якая ўздзейнічае на духоўны свет і псіхалагічны стан аўдыторыі. Своеасаблівымі сховішчамі і перадатчыкамі вобразна-сімвалічнай інфармацыі з'яўляюцца бібліятэкі, музеі, клубы, метадычныя цэнтры.

Фактычна інфармацыйна-творчы рэсурс адлюстроўвае дзейнасць прафесіяналаў у розных функцыянальных культурах: традыцыйнай, элітарнай і масавай. Створаныя імі мастацкія творы дэманструюць і аднаўляюць інтэлектуальна-эмацыянальную прыроду творчага працэсу. Зашыфраваная ў мастацкім творы інфармацыя ўспрымаецца рэцыпіентам праз разгортванне яго інтэлектуальных і духоўных

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

здольнасцей у кантакце з выканаўцам творчага дзейства. Дыялагічны характар разумення чалавекам мастацтва прынцыпова адрознівае яго ад атрымання навуковых ведаў, маналагічных па сваёй прыродзе. Засваенне перададзенай мастацкай інфармацыі ператварае ў партнёраў адзінага дзеяння таго, хто яе перадае, і таго, хто прымае.

Рост аб'ёму і хуткасці звароту інфармацыі ў сучасным грамадстве абумовіў паскарэнне амартызацыі прафесійных ведаў. У сувязі з гэтым важнае значэнне набывае сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнікоў і спецыялістаў. Пачатак XXI інфармацыйнага стагоддзя дэманструе, што вядучымі рэсурсамі ўстойлівага развіцця грамадства становяцца веды, іх засваенне і абнаўленне. Кожны чалавек уключаецца ў прастору бесперапыннай адукацыі — «адукацыі праз усё жыццё». Цэнтрам арганізацыйнага і інфармацыйнага развіцця спецыяліста становіцца сістэма ДАД.

Для галіны культуры такім цэнтрам з'уляецца Інбелкульт — дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі дарослых, сярод асноўных кірункаў работы якой — распрацоўка і рэалізацыя адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі, стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у сферы культуры; навукова-метадычнае і інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне дзейнасці ўстаноў адукацыі і арганізацый сферы культуры Беларусі [2].

Інфармацыйна-творчы рэсурс — змястоўны стрыжань адукацыйнага працэсу сістэмы ДАД у сферы культуры, што заканамерна, бо скіраваны ён на ўстановы культуры, якія праз сваіх спецыялістаў выконваюць інфармацыйную функцыю: забяспечваюць назапашванне, захоўванне і перадачу навуковай і мастацкай інфармацыі.

Слухачы — гэта таксама персаніфікаваныя ўладальнікі інфармацыйна-творчага рэсурсу. Па-першае, яны валодаюць уласнымі ведамі, вопытам і маюць пэўныя прафесійныя вынікі, творчыя здабыткі. Па-другое, яны прадстаўляюць канкрэтныя ўстановы культуры, цесна звязаныя з мясцовымі традыцыямі і прафесійнымі напрамкамі дзейнасці, скіраванымі на існуючыя магчымасці. Гэта значыць, што слухачы зацікаўлены ў абмене вопытам работы, у раскрыцці «сакрэтаў» руху, абмінання перашкод. Яны паўнавартасныя суб'екты адукацыйнага працэсу і павінны якасна ўпісвацца ў суб'ект-суб'ектныя адносіны з прафесарска-выкладчыцкім саставам.

Такія суб'ект-суб'ектныя адносіны фарміруюцца ў сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў культуры, якая разгорнута ў Інбелкульце і дае магчымасць задаволіць усе кірункі прафесійнай дзейнасці галіны. Інбелкульт выступае як калектыўны суб'ект адукацыйнай дзейнасці, які скіраваны на дыялагічныя адносіны са слухачамі.

Галоўным звяном адукацыйнага цыкла з'яўляецца лекцыя, якая выконвае навуковыя, выхаваўчыя і светапоглядныя функцыі, надае вучэбнаму курсу канцэптуальнасць, уводзіць слухача ў творчую лабараторыю. Ужываюцца лекцыі праблемныя, лекцыі-візуалізацыі (з узмоцненым элементам нагляднасці), лекцыі-гутаркі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(дыялог з аўдыторыяй), іншыя творчыя інавацыйныя формы правядзення аўдыторных заняткаў.

Так, напрыклад, цыкл інтэрактыўных лекцый ажыццяўляецца ў Інбелкульце па напрамку арт-тэрапіі і заснаваны на дыялогавых формах узаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу. Метадалагічна лекцыі інтэграцыйна спалучаюць у сабе праблемную лекцыю і лекцыю з разборам пэўных сітуацый. Пры гэтым выкарыстоўваюцца актыўныя тэхналогіі навучання: дыскусія, гутарка, мадэрацыя, дэманстрацыя відэарада з каментарыямі, мазгавы штурм, матывацыйная гаворка і інш.

Інтэрактыўнымі з'яўляюцца арганізаваныя Інбелкультам лекцыі з элементамі музычна-дыдактычных гульняў, гэта — значны кампанент у структуры сучасных тэхналогій мастацкай адукацыі. Гульня ўяўляе сабою экзістэнцыяльны феномен, які валодае велізарным пазнавальным, развіваючым, творчым уплывам на патэнцыял асобы.

Працягам інтэрактыўнай скіраванасці навучання, увядзеннем у непасрэдную практыку служаць трэнінгі з выкарыстаннем гульнёвых тэхналогій, што дае магчымасць больш актыўнага засваення слухачамі важных формаўтваральных кампанентаў музыкі, сродкаў мастацкай выразнасці.

Адмысловая форма — лекцыя-канцэрт для навучэнцаў музычнага профілю. Дадзены фармат дазваляе наглядна, больш эфектыўна засвоіць сэнс і прынцыпы творчага мастацкага развіцця асобы.

Традыцыйна вядучай формай навучання ў Інбелкульце з'яўляюцца практычныя заняткі з ужываннем метаду рэпрадуктыўнага навучання, які забяспечвае сувязь тэорыі і практыкі, што дазваляе слухачам абнавіць уменні і навыкі прафесійнай дзейнасці, пашырыць прафесійны далягляд. Яны складаюць значную частку вучэбных гадзін на групу. Псіхолага-педагагічны кампанент ажыццяўляецца ў форме практычных інтэрактыўных заняткаў з выкарыстаннем дыскусій, віктарын, case-study.

Распаўсюджаны заняткі ў форме майстар-класаў, на правядзенне якіх запрашаюцца вядучыя спецыялісты культуры. Так, народны артыст Рэспублікі Беларусь прафесар І.У. Алоўнікаў для піяністаў дае творчыя цыклы па разнастайных тэмах фартэпіяннага мастацтва.

Для кіраўнікоў аматарскіх творчых калектываў аб'яднанняў беларусаў замежжа праводзяцца майстар-класы па тэматыцы захавання культурнай самабытнасці і прэзентацыі беларускай культуры за мяжой.

Важнымі з'яўляюцца актыўныя формы навучання (далей — АФН), у пераважнай большасці гэта круглыя сталы і тэматычныя дыскусіі. Да ўдзелу ў іх запрашаюцца вядомыя спецыялісты ўстаноў адукацыі, арганізацый культуры, дзяржаўных органаў кіравання.

Круглыя сталы і практычныя заняткі праводзяцца на замацаваных базах культурнай практыкі. Гэта найбольш дзейсная форма павышэння кваліфікацыі, максімальна набліжаная да практычнага творчага асяроддзя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для якаснай ацэнкі інфармацыйна-творчых рэсурсаў ужываецца паняцце «*інфармацыйна-творчая магутнасць*» устаноў культуры [1]. Дадзенае паняцце характарызуе наяўнасць магчымасцей для ажыццяўлення дзейнасці па задавальненню культурных запатрабаванняў насельніцтва. Для бібліятэк інфармацыйна-творчая магутнасць вызначаецца колькасцю кніг, часопісаў і іншых адзінак матэрыяльных носьбітаў інфармацыі, іх пазнавальнай каштоўнасцю (складам аўтараў, навізной навуковай і публіцыстычнай інфармацыі); для тэатральна-відовішчных арганізацый — мастацкім зместам рэпертуару, майстэрствам, талентам і абаяннем выканаўцаў, высокай прафесійнасцю рэжысёраў, сцэнографаў і мастакоў-пастаноўшчыкаў; для музеяў — колькасцю экспанатаў, іх гістарычнай, мастацкай каштоўнасцю, унікальнасцю, прапанаванымі наведвальнікам эспазіцыямі і экскурсіямі; для клубных устаноў — ахопам культурна-масавых мерапрыемстваў, уцягваннем насельніцтва ў арганізацыю творчых праектаў.

Значнай інфармацыйна-творчай магутнасцю валодаюць адукацыйныя ўстановы сферы культуры, якія забяспечваюць перш за ўсё данясенне каштоўнасцей культуры ў грамадства праз навучанне дзяцей, моладзі, дарослага насельніцтва.

Праз пераемнасць мастацка-адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца захаванне і развіццё культуры. Спецыялісты галіновых устаноў культуры актыўна абменьваюцца вопытам, перадаюць веды сваім вучням, калегам. Многія з іх сваёй творчасцю абумоўліваюць узровень мастацкай культуры, фарміруюць эстэтычныя густы насельніцтва.

Інбелкульт як носьбіт інфармацыйна-творчай магутнасці праяўляецца ў фарміраванні, валоданні і перадачы неабходнай сацыяльна-культурнай інфармацыі спецыялістам і арганізацыям культуры.

Інбелкульт — непасрэднае звяно сувязі паміж жывой мастацкай практыкай і яе метадычным асэнсаваннем, выкарыстаннем; яго наяўнасць з'яўляецца перадумовай эфектыўнай работы галіны. Дзякуючы яму адбываецца ўкараненне перадавых арганізацыйна-творчых методык у дзейнасць устаноў культуры, аналітычнае абагульненне сацыякультурных працэсаў, рэалізацыя рэгіянальнай культурнай палітыкі, захаванне і папулярызацыя народных традыцый.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Киселева, Т.Г.* Ресурсная база социально-культурной деятельности / Т.Г. Киселева, Ю.Д. Красильников // Социально-культурная деятельность : учебник. — М. : МГУКИ, 2004. — 539 с. — С. 400.
2. Навукова-метадычнае і інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне дзейнасці ўстаноў адукацыі і арганізацый сферы культуры Беларусі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://inbelkult.by/by/contact. — Дата доступа : 14.07.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ